Гарыць яго зорка

НАРЫС

Ціха на Яноўскай-Набярэжнай на заходзе сонца. І наогул гэта адно з самых защішных месц у Віцебску. Стоячы на высокім беразе, выразна ўлоўліваеш дыханне разамлеўшай на сонцапёку за дзень ракі.

На беразе хлапчукі гуляюць у вайну. Яны атакуюць умоўнага праціўніка — лодкі, што стаяць каля прычала. Васіль Аляксандравіч з цікавасцю назірае за ходам «баявых дзеянняў». «Ура-а-а!» — коціцца ля самай вады ваяўнічы клічь.

— Вось я вас зараз! — чуецца з дашчанай старожкі буркліві голас, а ўслед за ім вылятае вартаўнік. Чародка рабят умомант ацэньвае абстаноўку і паварочвае ўбок.

— Вось я вас! — паўтарае на рацэ рэха.

Васіль Аляксандравіч вясёлым позіркам праводзіць дзяцей. Вось гэтак жа і ён, Вася Дзямідаў, бегаў па гэтай вуліцы. Хлапечая непаседлівасць засталася ў Васіля Аляксандравіча на ўсё жыццё. Мабыць, яна і прывяла яго, прафесіянальнага ваеннага, камандзіра высокага рангу, што пайшоў у запас, да дзяцей — Дзямідаў некалькі год працаваў у школе, якая знаходзіцца паблізу з вуліцай яго дзяцінства. Будучы загадчыкам школьных майстэрань, вучыў рабят працаваць, выхоўваў у іх павагу да чарнавой, звычайнай работы. Ён лічыў і лічыць, што без гэтай павагі нельга дасягнуць вышынь ні на зямлі, ні ў небе...

...Да вайны заставалася тры гады. У вучня дзевятага класа аэраклубаўца Васіля Дзямідава быў першы самастойны палёт. Васіль з хваляваннем ішоў з інструктарам да По-2, непрыкметна прыспешваў крок, хоць стараўся трымацца паважна, дзеловіта, як бывалы пілот. І чым бліжэй да самалёта, тым больш выразнае адчуванне, быццам у цябе за спіной выраслі крылы...

Тады ён зрабіў свой выбар. З сярэдняй школы Васіль Дзямідаў пайшоў у школу ваенных лётчыкаў, якая размяшчалася ў Барысаве. І пацягнуліся дні вучобы на зямлі і ў небе.

Савецкая краіна будавала, вырошчвала хлеб, але ў нашым небе, яшчэ ціхамірна чыстым, пахла навальніцай. У тую памятную нядзелю, 22 чэрвеня, курсант Дзямідаў знаходзіўся ў летнім лагеры. Васіль збіраўся з таварышамі парыбачыць на Начы, а таму вучлёты падняліся раней звычайнага, хоць і быў вольны ад заняткаў дзень. Дзямідаў ішоў да ракі па роснай сцежцы і слухаў перадранішнюю цішыню. Следам амаль нячутна крочыла некалькі курсантаў. Раптам з-за гарызонта выплыла чарада самалётаў. Яны ішлі ў напрамку Мінска, да якога ад лагера было рукой падаць.

— Не толькі нам не спіцца, — заўважыў Дзямідаў. — Глядзіце, як іх многа!

— Можа, манеўры якія-небудзь?

У гэты час з-за лесу выбліснула сонца і асвяціла на чэраве самалётаў крыжы...

Школа эвакуіравалася ў глыбокі тыл, у Сібір. Але курсанты рваліся ў бой, у неба, дзе іх старэйшыя таварышы ўжо біліся з фашыстамі.

— Нельга, хлопцы! — з разуменнем глядзеў на іх начальнік школы. — Ваш час яшчэ прыйдзе. Вораг моцны. Відаць, спатрэбіцца не год і не два, каб зламаць яго.

Але вось закончылася вучоба. Нарэшце можна ехаць на фронт. І тут, як снег на галаву, рашэнне: «Будзеце перавучвацца. Прыйшла новая тэхніка».

Новай тэхнікай аказаўся двухфюзеляжны самалёт — пікіруючы бамбардзіроўшчык Пе-2. Лётчыкі хутка асвоілі машыну, але з адпраўкай іх на фронт марудзілі. У 1942 годзе ў



школу прыехаў для адбору людзей у часць камандзір асобнага разведвальнага палка Аляксандр Карпавіч Родзін. Пятнаццаць шчасліўчыкаў трапіла ў гэту каманду. Сярод іх быў і сяржант Васіль Дзямідаў. Паплечнік і сябар праслаўленага Міхаіла Громава, Родзін быў першакласным лётчыкам. Ён добра ведаў, што значыць у сучаснай вайне паветраная разведка.

— Вы, хлопцы, не бядуйце, што не трапілі ў знішчальнікі ды ў бамбардзіроўшчыкі, — усміхнуўся Родзін. — Вам работы хопіць, ой, як хопіць. І з авіяцыяй праціўніка давядзецца сустракацца. Лётчыку вашага профілю, бадай, як нікому іншаму неабходна мець мужнасць, добрае веданне справы, кемлівасць, волю да перамогі.

Пасля, калі Васіль Аляксандравіч пачаў выконваць баявыя заданні, ён зразумеў, наколькі праўдзівымі былі словы камандзіра палка.

Баявое хрышчэнне Васіль Дзямідаў атрымаў у сакавіку 1943 года. Спачатку яго заданні былі нескладаныя. Але ў любы момант на савецкі самалёт-разведчык маглі напасці знішчальнікі праціўніка, ён мог быць расстраляны зенітнай артылерыяй. І ўсё ж страшней за смерць было прапасці без вестак. Гэта часам здаралася з таварышамі Дзямідава. І, вылятаючы на заданне, лейтэнант Васіль Дзямідаў — у гэты час ён ужо стаў афіцэрам — думаў аб адным: «Любой цаной здабыць разведданыя, а калі суджана быць збітым, то, чым трапіць у палон, лепш памерці ў няроўным баі». Дзямідаў заўсёды ўспамінаў свайго аднакашніка па ваеннай школе, камсорга палка Барыса Вахрамеева. Барыс сфатаграфаваў варожы аэрадром і вяртаўся з задання. Небяспека з'явілася нечакана, калі да сваіх было рукой падаць. Шэсць фашысцкіх знішчальнікаў вынырнулі з воблака і атакавалі Вахрамеева. Экіпаж прыняў бой. Загарэўся адзін «месер», потым — другі. Але полымя ахапіла і машыну Вахрамеева. Барыс загадаў экіпажу пакінуць самалёт, сам ён рашыў у што б там ні было даставіць фотаздымкі фашысцкага аэрадрома ў штаб. Машыну, якая ўжо страчвала вышыню, першым пакінуў штурман Сцяпан Шмацько, але парашут яго загарэўся, і Сцяпан загінуў на вачах Вахрамеева. Можна было ўзяць касеты з плёнкай і выскачыць самому, але ў шлемафоне Вахрамееў пачуў слабы голас стралка-радыста Рыгора Афоніна: «Камандзір, я ранены ў ногі». Спіскаючы штурвал абгарэлымі рукамі, Вахрамееў вёў самалёт на пасадку. У яго выпеклі ад агню вочы, абгарэў твар, і ўсё ж самалёт сеў. Жыццё стралка-радыста было выратавана, заданне выканана, але Барыс Вахрамееў памёр. Полк хаваў свайго любімца, не ўтойваючы слёз. На магіле Барыса Васіль Дзямідаў пакляўся быць надобным на сябра.

Гэта клятва не раз была выпрабавана на вернасць. Аднойчы экіпажу Дзямідава, ужо вопытнага разведчыка, ардэнаносца, было даручана вельмі важнае заданне — сфатаграфаваць перадавую лінію абароны ворага на Бярэзіне. Гэта былі знаёмыя для яго мясціны, гэта было неба, дзе ён 22 чэрвеня ўбачыў чорных прадвеснікаў вайны.

Выканаўшы заданне, Дзямідаў узяў курс на свой аэрадром. І тут убачыў чатыры самалёты «фоке-вульф-190». Ён адразу пазнаў знішчальнікаў па сілуэтах. «Фокеры», або «лапцёжнікі», як іх ахрысцілі нашы лётчыкі за . бранявыя пыцькі, нагадваючыя лапці, ішлі строем, паважна, гатовыя расквітацца з адзінай «пешкай» умомант. Дзямідаў ужо сустракаўся з самалётамі праціўніка, але тады гэта былі баі сам-насам, а тут справа сур'ёзная.

— Прымаем бой, рабяты! — загадаў Дзямідаў.

Ход «пешкі» быў нечаканым для фашыстаў. Яны думалі, што савецкі самалёт кінецца наўцёкі, а тут — лабавая атака. Чадным агаркам паляцеў уніз адзін «фокер», што трапіў у прыцэл стралка-радыста Івана Мінаева. Загарэўся факелам і ўзарваўся ў паветры другі. Гэта не прамахнуўся штурман Уладзімір Палоўчанка. Малайцы, хлопцы! Але тут здарылася непрадбачанае — змоўклі абодва кулямёты. У абодвух перакасіла стужкі, таму што стральба вялася пад вялікім вуглом. Фашысцкія самалёты навіслі над «пешкай». Дзямідаў кідае самалёт у віражы, адчуваючы, як варожыя кулі ўпіваюцца ў цела Пе-2. А «фокеры» не адстаюць, працягваюць насядаць. Ужо відаць нашы перадавыя пазіцыі. І тады Дзямідаў кідае самалёт у зацяжное піке і выводзіць яго над самай зямлёй. Выкарыстаўшы гэты манеўр, з зямлі па ворагу ўдарылі нашы зеніткі...

На аэрадроме тэхнік Іван Рыбакоў пажартаваў:

— Камандзір, я ўжо налічыў 80 прабоін у нашым самалёце. Гэта яшчэ не ўсё. Словам, можна спаборнічаць з рэшатам.—А потым дадаў сур'ёзна: — А наогул слаўная машына.

Але яшчэ большае выпрабаванне выпала на долю старшага лейтэнанта Васіля Дзямідава і яго таварышаў у лістападзе 1944 года. Экіпажу было даручана сфатаграфаваць крэпасць Кёнігсберг.

Дзямідава суправаджалі на знішчальніках 12 французаў з палка «Нармандыя — Нёман». Ужо гэта лічба гаварыла аб тым, што камандаванне надае велізарнае значэнне выкананню задання. Пры падыходзе да цэлі варожыя зеніткі адкрылі загараджальны агонь. Знішчальнікі пачалі штурм агнявых кропак ворага, а самалёт-разведчык тым часам прашмыгнуў у вузкі калідор паміж разрывамі снарадаў.

— Камандзір, вышыня 2100, — далажыў тым часам штурман Віктар Пракоф'еў. — Будзем пачынаць работу?

Цэлую гадзіну самалёт-разведчык вісеў над цытадэллю ворага і яе наваколлем, фатаграфуючы абаронныя рубяжы гітлераўцаў, размяшчэнне войск і сканцэнтраванне тэхнікі. Варожыя зеніткі, як ні перашкаджалі ім савецкія штурмавікі, стараліся ўзяць у прыцэл адважны самалёт-разведчык. Машыну падкідвала блізкімі разрывамі снарадаў, раскачваючы яе, амаль асуджаную, на страшэнных арэлях. Часам асколкі шасталі аб плоскасці самалёта. Твар у твар са смерцю экіпаж выконваў заданне. Раптам моцны ўдар страсянуў машыну. «Прамое пападанне!» — мільганула ў думках Дзямідава. І тут жа ён адчуў цёплы струмень, што спаўзаў з-пад шлема. Ранены. Але не гэта зараз непакоіла пілота — паявіліся моцныя перабоі ў правым маторы. Васіль Аляксандравіч ведаў, што гэта небяспечная арытмія. А матор ужо зачхаў і замёр. Машыну рэзка кінула ўбок. Дзямідаў імкнуўся выраўняць зракены самалёт. Экіпаж працягваў дзейнічаць, таму што працаваў другі матор, а галоўнае — тры адважныя сэрцы, і пакуль біліся гэтыя сэрцы, трэба было працаваць — яшчэ не ўвесь зададзены ўчастак быў сфатаграфаваны. Камуніст Васіль Дзямідаў і яго таварышы Віктар Пракоф'еў і Мікалай Барбацько працавалі. У кабіну пілота пачалі паступаць ядавітыя пары бензіну — быў прабіты пэнтральны бак. Белая заслона засцілала вочы, але Дзямідаў, ранены ў галаву, не выпускаў з рук штурвалу, пакуль не былі сфатаграфаваны апошнія кіламетры абароннай паласы ворага. Пачаў здаваць і левы матор, але ўсё бліжэй былі свае. Ледзь-ледзь самалёт пераваліў перадавую пазіцыю нашых войск, рухавік сутаргава закашляў. Не выпускаючы шасі, Дзямідаў пасадзіў самалёт з заміраючым вінтом на поле. І тут ён убачыў, што да самалёта бяжыць цыбаты чырвонаармеец.

— Вы што, хочаце архангеламі стаць? — крычаў ён.

Аказалася, што самалёт сеў на наша мінnае поле. Вінтом былі выкапаны дзве міны, але апошняе вярчэнне прапелера аказалася настолькі слабым, што ўзрывацелі не спрацавалі.

— Даражэнькія мае! — зразумеўшы, у чым справа, салдат працягнуў рукі разведчыкам. — Ды вы проста ў кашулях нарадзіліся.

На мінным полі стаялі трое лётчыкаў, бясконца шчаслівыя і ад таго, што засталіся жывыя, і ад таго, што даставілі каштоўныя звесткі. Гэта стратэгічна важнае заданне, як і іншыя, было выканана ў першую чаргу дзякуючы камандзіру экіпажа Васілю Дзямідаву. Не выпадкова камандзір палка, ас паветранай разведкі А. К. Родзін напісаў у характарыстыцы Дзямідава: «Выдатна валодае ўсімі відамі, спосабамі і метадамі вядзення паветранай разведкі. Лятае ў воблаках і складаных метэаўмовах, нягледзячы на шматразовыя абстрэлы зенітнай артылерыі і неаднаразовыя процідзеянні знішчальнай авіяцыі праціўніка, выдатна выконвае пастаўленыя заданні, праяўляючы пры гэтым выключную адвагу, настойлівасць, хітрасць, назіральнасць, кемлівасць і ініцыятыву».

А колькі такіх заданняў было за гады вайны ў Дзямідава! Камандзір звяна 10-га Маскоўскага Чырванасцяжнага асобнага разведвальнага авіяпалка старшы лейтэнант В. А. Дзямідаў зрабіў 226 вылётаў, 175 з іх — для паветранай разведкі і фатаграфавання абаронных рубяжоў, груповак і рэзерваў праціўніка. Экіпаж Дзямідава сфатаграфаваў 24150 квадратных кіламетраў тэрыторыі размяшчэння ворага, 165 дзеючых аэрадромаў, выявіў 1678 самалётаў, 927 чыгуначных саставаў і эшалонаў, 32908 аўтамашын з жывой сілай ворага. Трэба яшчэ дадаць, што ад трапных чэргаў экіпажа знайшлі канец 8 самалётаў праціўніка. Гэта подзвіг. Ён быў па заслугах ацэнены Радзімай. В. А. Дзямідаву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Ён узнагароджан ордэнам Леніна, чатырма ордэнамі Баявога Чырвонага Сцяга, ордэнам Багдана Хмяльніцкага III ступені, двума ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, ордэнам Чырвонай Зоркі і многімі медалямі. Дзямідаў змагаўся за перамогу савецкага народа ў небе Падмаскоўя, Смаленшчыны, Беларусі, Усходняй Прусіі, прайшоўшы баявы шлях у авіяцыі ад сяржанта да палкоўніка, ад радавога лётчыка да камандзіра палка.

...Не толькі на Яноўскай-Набярэжнай, але і на суседніх вуліцах ведаюць дом, дзе жыве В. А. Дзямідаў. З гэтых вуліц вядуць сюды сцежкі чырвоных следапытаў. Рабяты распытваюць Васіля Аляксандравіча і аб баявых днях, і аб мірным жыцці. Дзямідаў па ранейшаму служыць небу. Ён — дыспетчар Віцебскага аэрапорта, кіруе палётамі. Яго голас, што гучыць у эфіры, добра ведаюць лётчыкі сельскагаспадарчай і санітарнай авіяцыі.

— Калі дзяжурыць Дзямідаў, — кажуць у аэрапорце, — можна быць спакойным за палёт.

Дарэчы, за мірную працу камуніст В. А. Дзямідаў узнагароджан Граматай Вярхоўнага Савета БССР. Гарыць, ярка гарыць яго зорка на небасхіле народнай славы, і верыцца, што яе ззянне стала путяводным святлом для многіх хлапчукоў.

І. ПЕХЦЕРАЎ.

На здымку: В. А. Дзямідаў.
Фота **А. Хітрова.**